Белорусские предприятия легкой промышленности также могут прорабатывать вопрос по вхождению на рынок Индонезии. Большинство заводов, сосредоточенных на выпуске готовых тканей, находятся в Бандунге. Практически большая часть легкой промышленности работает на импортируемом сырье.

Транспортная система островов Суматра, Ява и Мадура требует дальнейшего расширения путем создания современной инфраструктуры, развития сети логистических систем, подвода коммуникаций. В данном направлении могут сработать белорусские строительные компании.

Особый интерес индонезийских военных вызывает производство белорусских систем радиолокации, автоматическое радиолокационное распознавание различных типов, целей, классов и систем ПВО, а также оптические системы зондирования Земли. Беларусь также может предложить обучение военных и военно-технических кадров.

После введения Индонезией в марте 2015 г. безвизового режима для белорусских граждан сроком до 30 суток увеличилось количество туристов, а также деловых визитов. Данное решение позволит в дальнейшем укрепить и расширить сотрудничество между Беларусью и Индонезией в выстраивании деловых контактов по многим направлениям.

## ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А. ЛУКАШЭНКА АБ СТРАТЭГІЧНЫМ (ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫМ) ВЫБАРЫ БЕЛАРУСІ

***Снапкоўскі У. Е.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка неаднаразова ўздымаў у сваіх выступленнях праблему геапалітычнага становішча і стратэгічнага (цывілізацыйнага) выбару Рэспублікі Беларусь. Значнае месца гэтай тэматыцы было нададзена ў праграмным дакладзе «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь у новым свеце», з якім ён выступіў 22 ліпеня 2004 г. на нарадзе з кіраўнікамі замежных установаў Беларусі. Даклад ўяўляў сабой канцэптуальны выклад асноў знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, якая ўступіла ў другое дзесяцігоддзе сваёй незалежнасці

У гэтым выступленні змяшчаецца раздзел аб стратэгічным выбары Беларусі. Адказваючы на пытанне, ці хоча Беларусь стаць членам Еўрапейскага саюза і што яна выбірае: Усход ці Захад, А. Лукашэнка сказаў, што выбар, які нам звычайна спрабуюць навязаць як лёсавызначальны — Усход або Захад — гэта не выбар, а ілжывая дылема. «Мы выбираем Беларусь, которая в силу экономики, в силу истории, в силу географии, в силу культуры и менталитета будет и на Востоке, и на Западе». Гэтае сцвярджэнне трэба было разглядаць, на наш погляд, як імкненне Беларусі праводзіць больш збалансаваную знешнюю палітыку і выправіць, па словах самога Прэзідэнта, той «дичайший крен на Восток», дапушчаны ім у перыяд інтэграцыйнай гарачкі ў адносінах з Расіяй у 1996—1999 гг.

Выказаныя ў праграмным дакладзе А. Лукашэнкі ідэі, ацэнкі, прапановы, а таксама задачы, пастаўленыя перад урадам, МЗС, Міністэрствам эканомікі і іншымі міністэрствамі і ведамствамі, акумуліравалі тэарэтычныя і практычныя напрацоўкі і дасягненні прадстаўнікоў розных грамадскіх навук Беларусі

(эканамістаў, палітолагаў, міжнароднікаў, гісторыкаў і інш.), а таксама дыпламатычных работнікаў і аналітыкаў з урадавых колаў. Гэта тычылася ў першую чаргу абгрунтаваных навуковых палажэнняў аб Беларусі як сярэдняй еўрапейскай дзяржаве, неабходнасці раўнацэннага развіцця двух вектараў беларускай знешняй палітыкі (усходняга і заходняга), актывізацыі беларускай дыпламатыі на лацінаамерыканскім кірунку, плюсах і мінусах адкрытай эканомікі Беларусі, змяншэнне эканамічнай залежнасці ад Расіі. З некаторымі з гэтых навуковых палажэнняў, тэзісаў і фармулёвак (адносна геапалітычнай пазіцыі Беларусі як сярэдняй еўрапейскай дзяржавы, прапановы аб развіцці адносін з Расіяй на аснове прынцыпаў стратэгічнага партнёрства, а не палітычнай інтэграцыі) выступаў і аўтар у сваіх публікацыях у 1990-х і пачатку 2000-х гг.

Тэматыка геапалітычнага становішча і цывілізацыйнага выбару Беларусі атрымала сваё развіццё ў дакладзе Прэзідэнта А. Лукашэнкі на IV Усебеларускім сходзе 6 снежня 2010 г., у якім у прыватнасці адзначалася: «Статус «перекрестка», которым геополитически наделена Беларусь, мы понимаем как связующее звено, артерию между Западом и Востоком. Но не как барьер, буфер или санитарный кордон и ни в коем случае не проходной двор». У гэтым дакладзе ідэя стратэгічнага выбару Беларусі, пастаўленая ў 2004 г., была ўжо развіта да канцэпцыі «роўнай набліжанасці» да Усходу і Захаду. Яе сутнасць — збалансаванае развіццё усходняга і заходняга вектараў знешняй палітыкі, фарміраванне пояса добрасуседства па ўсім перыметры межаў Беларусі. Галоўная задача, якая выцякае, калі прытрымліваццa такога стратэгічнага курса, заключаецца ў максімальна эфектыўным выкарыстанні геапалітычнага рэсурсу краіны.

У рэальнасці аднак правільная па сваёй сутнасці стратэгія «роўнай набліжанасці», абвешчаная ў перыяд «адлігі» ў адносінах Беларусі з Захадам і якая скончылася пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 г., не магла быць рэалізаванай у гады адкату, які доўжыўся да пачатку расійска-ўкраінскага канфлікту. Аб роўнай набліжанасці да двух цэнтраў сілы, паміж якімі знаходзіцца Беларусь, пакуль рана казаць і сёння, калі пачаўся цяжкі і складаны працэс нармалізацыі адносін з Захадам. Беларусь у значнай ступені ў сілу гістарычных абставінаў, і, вядома, па сваёй, калі можна так сказаць, віне застаецца непараўнальна больш набліжанай да Усходу (Расіі), чым да Захаду. Таму гэтая ідэя пакуль больш нагадвае трапную тэарэтычную канструкцыю і шчырае пажаданне на будучыню, чым рэальную стратэгічную ўстаноўку, рэалізацыя якой сур'ёзна абцяжарана складанай геапалітычнай сітуацыяй, у якой застаецца Беларусь, маючы на ўвазе ўжо працяглы перыяд замарожанага стану адносін з Захадам (пасля рэферэндуму 1996 г.).

У кастрычніку 2011 г. Прэзідэнт А. Лукашэнка апублікаваў у газеце «Известия» артыкул «О судьбах нашей интеграции», дзе вылучыў ідэю «інтэграцыі інтэграцый», накіраваную на збліжэнне дзвюх інтэграцыйных груповак на прасторы Еўразіі — Еўрапейскага саюза і Еўразійскага саюза і стварэнне ў выніку іх ўзаемадзеяння агульнай эканамічнай прасторы ад Лісабона да Уладзівастока. Ідэя «інтэграцыі інтэграцый» з'яўлялася развіццём стратэгічнай ўстаноўкі аб «роўнай набліжанасці» да Усходу і Захаду. Аднак і гэтая цікавая і плённая думка, якая атрымала спрыяльны водгук у Брусэлі, не дачакалася пакуль свайго часу.

У цяперашні час яна далёкая ад рэалізацыі ў сувязі з ускладненнем міжнароднай сітуацыі ва Усходняй Еўропе з-за расійска-ўкраінскага канфлікту і крызіснымі з'явамі ў развіцці ЕС.

Падагульняючы сказанае, адзначым, што пасля 2000 г. Прэзідэнт Беларусі спрабуе паменшыць залежнасць ад Расіі, што знайшло адлюстраванне як у выказаных ім канцэпцыях і дактрынальных устаноўках, так і ў рэалізаваных знешнепалітычных стратэгіях і курсах («шматвектарная знешняя палітыка», адраджэнне канцэпцыі нейтралітэту, «роўнай набліжанасці да Усходу і Захаду», «інтэграцыя інтэграцый»). Верагодна ў палітычнай сферы гэтую залежнасць атрымалася паменшыць, праўда больш сімвалічна, аб чым кажа выгаранне (зжыванне сябе) праекта Саюзнай дзяржавы і стаўка У. Пуціна на стварэнне Еўразійскага саюза, у эканамічнай і ваеннай сферах яна прынамсі не зменшылася.

## КУЛЬТУРНО-ГУМАНИТАРНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО КНР С РЕСПУБЛИКОЙ БЕЛАРУСЬ В 1992—2013 гг.

***Сунь Инцзе,*** *Белорусский государственный университет*

20 января 1992 г. КНР и Беларусь официально установили дипломатические отношения. С 1992 г. по 2013 г. договорно-правовую базу двусторонних отношений пополнили более 70 межправительственных и межведомственных соглашений, включая порядка 20 соглашений в области культурно-гуманитарного сотрудничества.

**Сотрудничество в области образования.** Договорно-правовая база сотрудничества в области образования заложена Соглашением между Правительством КНР и Правительством Республики Беларусь о культурном сотрудничестве от 25 ноября 1992 г.. Межправительственное соглашение о взаимном признании документов об образовании (28 октября 1998 г.) и межправительственное соглашение о взаимном признании документов об ученых степенях (26 июля 2000 г.) легализовали взаимное признание конкретных документов о среднем и высшем образовании и об ученых степенях магистра (с сохранением, однако, в дальнейшем на практике вопроса трактовки данной степени), кандидата наук (*Ph.D*) и доктора наук.

Первоначальный импульс получило межвузовское сотрудничество и взаимодействие в оласти изучения китайского языка. В 2000 г. между Хэнаньским университетом и БГУ были впервые установлены партнерские отношения. В мае 2002 г. в МГЛУ впервые был проведен конкурс «Китайский язык — мост». Знаковое соглашение между Министерством образования Республики Беларусь и Государственной канцелярией КНР по международному распространению китайского языка о сотрудничестве в области преподавания китайского языка было подписано в 2006 г. Одновременно был открыт первый Институт Конфуция при БГУ.

В целом, сотрудничество обеих стран в области образования во второй половине 2000-х гг. развивалось несколько более активно: по 2013 г. БГУ сотрудничал с 19 вузами Китая, БГЭУ — с 6 вузами Китая, БНТУ — с 6 вузами Китая